5Ис 2787

# ЗБОРНІК
## КУПАЛЬСКІХ І ЖНІЎНЫХ
## БЕЛАРУСКІХ ПЕСЬНЯЎ

Менск 1943 г.

ас-52 Ба 234443
52/с 2787

1964 г.

234443
ас-52

# ЗБОРНІК
## КУПАЛЬСКІХ і ЖНІЎНЫХ БЕЛАРУСКІХ ПЕСЬНЯЎ

*Улажыў М. ШЧАГЛОЎ*

---

МЕНСК 1943 г.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

Schul- und Jugendverlag Minsk
Выданьне: Выдавецтва Падручнікаў і Літаратуры для Моладзі у Менску

---

Druck: Minsker Verlags- und Druckerei GmbH, Minsk
Друк: Менскага Выдавецкага і Друкарскага Т-ва з абм. адк. у Менску

## ПРАДМОВА.

*Земляробства, якім займаецца бальшыня беларускага народу, і руплівасьць пра ураджай прымушалі беларусаў наглядаць усе зьявы у прыродзе. У сувязі з гэтым сонца, ад якога у вялікай меры залежыць ураджайнасьць нашыхніваў, у сівой мінуўшчыне мела боскую пашану. Нашы прашчуры верылі, што быў бог сонца, званы у некаторых мясцох Ярылам, а у некаторых Купалай, ці Дажбогам. У чэсьць бога-сонца ладзіліся розныя сьвяты. Адно з гэткіх сьвятаў адбывалася тады, калі дзень быў найдаўжэйшы, а ноч найкарацейшая і называлася Купальлем. У гэты час якраз закончваліся веснавыя і пачыналіся летнія работы. Пасьля прыняцьця хрысьціянства сьвяткаваньне гэта супала з днём сьвятога Івана (24-га чырвеня ст. ст.), якога народ уважае таксама прыяцелем земляробаў і называе Іванам Купалам.*

*Народ верыў, што у купальскія дні, асабліва у ночы на Івана ладзяць сабе сьвята розныя нячыстыя сілы — чэрці, ведзьмы, і што яны, лётаючы па полі, псуюць збожжа ды адбіраюць малако у кароваў. Адначасна аднак народ верыў, што у гэную ноч чалавек можа знайсьці шчасьце, калі ён знайдзе кветку папараці, якая прыносіць веду, багацьце і усё, чаго толькі чалавек захоча. Вось-жа ладзячы купальскія сьвяткаваньні увечары і уначы з 23 на 24 чырвеня нашы*

прашчуры стараліся недапусьціць да свайго дабра нячыстую сілу і знайсьці кветку папараці.

На купальскія сьвяткаваньні сабіралася галоўным чынам моладзь. Яна ладзіла карагоды, сьпявала розныя песьні вясьнянкі, раскладала вогнішча, скакала праз яго ды паліла у ім кудзелю ільну, каб радзіў добры лён і барану, каб быў добры ураджай. Вогнішча і гульні ладзіліся дзеля таго, каб напалохаць нячыстую сілу. Каб-жа адагнаць ад збожжа ведзьму, бралі з агню галавешку і кідалі яе у жыта, сьпяваючы пры гэтым адпаведныя песьні.

У сувязі з купальскімі сьвятамі паўстала многа прыгожых купальскіх песьняў пра ураджай, кветку шчасьця, а таксама каханьне, бо было у народзе вераваньне, што у купальскія сьвяты найлепш выбіраць сабе жаніха ці жонку. Так, прыкладам, людзі уважалі, што той хлопец, які зловіць дзяўчыну пры скоках праз агонь, будзе ейным жаніхом, а яна яму жонкай. Дзяўчаты каб даведацца, у які бок пойдуць замуж, або ці агулам выйдуць замуж, пушчалі на ваду у рэчках, азёрах ці ставох па два вянкі. Калі вянкі злучаліся, дык значыла, што дзяўчына выйдзе замуж за любага ёй хлапца, а калі не, дык ня выйдзе. У які-ж бок паплывуць вянкі, у той бок і дзяўчына выйдзе замуж.

Для змаганьня з нячыстай сілай і хваробамі у купальскія дні сабіраліся розныя зёлкі, наварам з якіх або дымам лячылі хворых.

Пасьля Купальля і Пятроўкі (29 чырвеня) на Беларусі хутка пачыналася жніво, збор пладоў нашае зямлі. Жніво таксама адбывалася з рознымі абрадамі і песьнямі. Перад жнівом перш за усё гаспадар аглядаў сваю ніву, ці збожжа сьпелае, ды ці няма у ім заломаў. Калі былі заломы, жніва не пачыналі датуль, пакуль пры помачы знахароў залом ня быў зьнішчаны. У некаторых мясцох Беларусі перад жнівом запрашаюць сьвятароў і сьвеньцяць усё збожжа.

Пачатак жніва ці, інакш кажучы, зажынкі адбываюцца пераважна у чацьвер, або сыботу пад вечар. Ідучы на зажынкі, гаспадыня нясе з сабою сыр, лусту хлеба ды крыху солі. Зажаўшы і зрабіўшы першы сноп, яна адпачывае, пасілкоўваецца ядою і пасьля, нажаўшы 10 ці 20 снапоў, вяртаецца дамоў з першым снапом, ставіць яго у хаце на покуці і больш у гэты дзень ня жнуць. У хаце-ж адчуваецца тады радасны урачысты настрой, бо хоць пара жніва і цяжкая, але сяляне спатыкаюць яе з радасьцяй. У жніво часамі ладзяць талаку і супольнымі сіламі па чарзе зжынаюць сьпелае збожжа. У часе зажынак, самога жніва і асабліва у часе дажынак нашыя нівы заўсёды гучаць мілагучнымі і мэлёдыйнымі народнымі песьнямі.

Дажынкі адбываюцца вельмі ўрачыста. На іх гаспадары запрашаюць на пачэстку нанятых жнеек, сваіх знаёмых, суседзяў і сваякоў, якія памагалі закончыць жніво. Калі жнеі канчаюць жаць, дык пакідаюць нязжаты кусьцік жыта. Гэтае жыта рвуць і робяць з яго снапок, так званую «казьліную бараду», ад старадаўнага вераваньня, што бог нівы быў падобны да казла. Але нязжаты кусьцік увесь не вырываюць. З яго астаюцца тры каласкі, як ахвяра богу нівы. На каласкі гэныя кладуць кусочак хлеба, крыху солі, ды паліваюць усё гэта вадою. Адначасна жнеі робяць з каласкоў вянок, кладуць яго на галаву найпрыгажэйшай жнеі, называюць яе царыцай дажынак і, узяўшы апошні снапок, ідуць з песьнямі дахаты, да гаспадара, дамагаючыся платы і пачастунку. Прыйшоўшы дахаты, царыца дажынак зьнімае вянок з свае галавы і кладзе яго на галаву гаспадара. Гаспадар за гэта дарыць яе і усіх жнеяў запрашае на пачэстку. У хаце жнейкі наўперад ставяць сноп — «бараду» на покуці і пасьля з песьнямі садзяцца за прыгатаваны для іх стол, ды весела закончваюць цяжкі, але і радасны час жніва.

Дажынкі заўсёды у нас лічыліся вялікім народным сьвя-

там. Цяпер сьвяткаваньне дажынак адбываецца ня толькі у кажнага гаспадара паасобку, але яны ладзяцца і у шырэйшых грамадзкіх колах у першую нядзелю месяца кастрычніка.

Сьвяткуючы сьвята Купальле, ладзячы зажынкі, жнучы, ды сьвяткуючы дажынкі, беларускі народ стварыў мноства прыгожых песьняў, з якіх толькі малая частка друкуецца у гэтым зборніку.

Няхай-жа гэтыя песьні далей гучаць па нашых нівах і у хатах і няхай весяляць, ды заахвочваюць наш народ да творчае працы на сваёй роднай зямліцы.

ВЫДАВЕЦТВА.

Менск, 25. 5. 1943

# АЙ, ШЛА КУПАЛА

(КУПАЛЬСКАЯ)




Ай, шла Купала сялом, сялом,
Купала, ой, рана!

Завесіўшы вочы пяром, пяром,
Купала, ой, рана!

А дзе Купала начавала,
Купала, ой, рана?

А ў агародзе пад лебядою
Купала, ой, рана!

# ДЫ НА КУПАЛЬЛЕ, НА ЯНА

(КУПАЛЬСКАЯ)




Ды на Купальле, на Яна
Іграла сонца, іграла.

Малойчык каня сядлае,
Яго мамачка пытае.

— Што табе, мамачка, да таго?
Паеду да цесьця да свайго,

— Каб дзеўка за ручаньку ўзяла,
Пярсьцёнак з ручкі каб зьняла.

# ІШЛА КУПАЛКА 3

(КУПАЛЬСКАЯ)




Ішла Купалка сялом, сялом,
Накрыўшы вочкі пяром, пяром.

Прыпеў: На Івана Купала,
Ой, ды на Івана Купала.

Накрыўшы вочкі, гаманіла:
— А дзе-ж мы будзем начаваці?

Прыпеў: На Івана Купала,
Ой, ды на Івана Купала.

— А дзе-ж мы будзем вячэраці?
— А ў Івана, Івана!

Прыпеў: На Івана Купала,
Ой, ды на Івана Купала.

# А НА ЯНА НОЧКА МАЛА 4

(КУПАЛЬСКАЯ)




А на Яна ночка мала, —
А я малада не даспала, —
Кароў у поле выганяла,
Сыры, масла, ой, зьбірала,
Купаліцу пераймала,
Ды на свой двор запрашала.

# ЯК ПОЙДЗЕМ МЫ ДЗЕЎКІ

5.

(КУПАЛЬСКАЯ)




Як пойдзем мы, дзеўкі,
Па вулцы шырокай. (2 р.)

Як зойдзем мы, дзеўкі,
Да Іванькі ў дворкі. (2 р.)

Ой, дасьць нам Іванька
Ды сваёй кулагі. (2 р.)

А у той кулазе
Пчоланькі бруялі. (2 р.)

Пчоланькі бруялі,
Мяды сабіралі. (2 р.)

# НА ЙВАНА НОЧКА МАЛЕНЬКАЯ 6.

(КУПАЛЬСКАЯ)




На Йвана ночка маленькая
Ня выспалася паненка.

Пайшла ў ягадкі — заснула,
Прыехаў панічок — ня ўчула.

Махнуў хусткаю — ня ўстала.
Відаць, дзеванька заспала.

— Прачнісь, дзеванька, ўстрапяніся
Ды навокал агляніся.

— Стаіць конічак вараны.
Хто на коніку? — Суджаны!

# А НА ГАРЫ ЦЭРКАЎКА 7.

(КУПАЛЬСКАЯ)

*Moderato assai.-Вельмі мерна*




А на гары цэркаўка, (2 разы)

На цэркаўцы крыжычак, (2 разы)

На крыжычку макаўка, (2 разы)

На макаўцы ластаўка, (2 разы)

Сядзіць яна высока, (2 разы)

Глядзіць яна далёка. (2 разы)

# ОЙ, БОРУ МОЙ
## (КУПАЛЬСКАЯ ЛІРЫЧНАЯ)

*Moderato. - Мерна*




— Ой, бору мой, бору мой,
Чаму, бору, ня шумён?

Як мне, бору, шумным быць,
У мяне, бору, птушак няма!

— Ой, двору мой, двору мой,
Чаму, двару, не мяцён?

— Як мне, двару, мяцёным быць,
Ў мяне, двару, дзевак няма!

— Адна была, Марысечка,
Адна была, маладая,—

— Сваты ўзялі на гульню,
Міколка сабе за жану!

# КУПАЛІНКА 9.

(КУПАЛЬСКАЯ-ЛІРЫЧНАЯ)




Купалінка, Купалінка, цёмная ночка,
Цёмная ночка, дзе твая дочка? (2 разы)

Мая дачка у садочку ружу, ружу паліць,
Ружу паліць, ружу паліць, белы ручкі коліць. (2 р.)

Кветачкі рвець, кветачкі рвець, вяночкі ўець.
Наце, наце вам, дзяўчаткі, усім па вяночку. (2 р.)

# ОЙ, ЧАБОР МОЙ ЗЯЛЁНЫ 10.

(КУПАЛЬСКАЯ)




— Ой чабор мой зялёны, (2 разы)
Дзе цябе пасадзіці, (2 разы)
Ці ў гародзе, на лясе, (2 разы)
Ці ў капуснай баразьне? (2 разы)
— Дзе хочаце, пасадзеце, (2 разы)
Толькі вецьця не ламеце (2 разы)
Ды лісточкаў не сарвеце. (2 разы)

# ВАСІЛЁЧАК 11.

(КУПАЛЬСКАЯ-ГУЛЬНЁВАЯ)

*Allegro moderato.-Даволі хутка*




— Васіля мой, Васілёчак, (2 р.)
Баровенькі твой кваточак. (2 р.)

— Часам цябе я садзіла,
Часам цябе палівала,

— Потым цябе я сарвала
І ў тым часу вянок зьвіла.

Дзеўкін вянок зелянее,
Ў малойца сэрца весялее.

# ОЙ, РАНА НА ЙВАНА 12.

(КУПАЛЬСКАЯ·КАРАГОДНАЯ)

*Allegro · Хутка*




Ой, рана на Йвана. (2 разы)
Проці Йвана ночка мала.
Ой, рана на Йвана. (2 разы)
Ой, рана на Йвана. (2 разы)
— Дзе Купала начавала?
Ой, рана на Йвана, (2 разы)
Ой, рана на Йвана. (2 разы)
— Начавала ў чыстым полі.
Ой, рана на Йвана, (2 разы)
Ой, рана на Йвана. (2 разы)
— У чыстым полі, у густым жыце,
Ой, рана на Йвана.

## 13. СЯНЬНЯ КУПАЛА, А ЗАЎТРА ЯНА

(КУПАЛЬСКАЯ)




Сяньня Купала, а заўтра Яна.
Будзе, хлопчыкі, усё ліха вам!
— Якое ліха, ліха якое?
— Пагоняць хлопцы сучак у поле!
Каторы хлопец ды не жанаты,
Пагоніць сучак, сучак куртатых!
Сяньня Купала, а заўтра Яна,
Будзе, дзеванькі, усё ліха вам·
— Якое ліха, ліха якое?
— Пагоніце сабак, сабак у поле.
Катора дзеўка яшчэ ня з простых,
Пагоніць сабак, сабак бясхвостых.

Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна
119

# А Ў КУПАЛЬСКУЮ НОЧ 14

(КУПАЛЬСКАЯ КАРАГОДНАЯ)




А ў Купальскую ноч
Выпяклі мы ведзьме вочы,

Каб у ночы не хадзіла,
Расы ня зьбірала,

Каб у жорнах не малола,
Каб і кашы не варыла,

Каб дзяцей не карміла,
Ведзьмаў не пладзіла.

# РАДЗІ, БОЖА, ЖЫТА 15.

(ЗАЖЫНКАВАЯ)




Радзі, Божа, жыта,
Жыта і пшаніцу,
Усякую ярыцу:
У полі — снапамі,
У гумне — стагамі,
А ў даму — пірагамі.
Дай-жа ты нам, Божа,
Жыта дажаці,
Ой, жыта павязаці.
У полі — снапамі,
У гумне — стагамі,
А ў даму — пірагамі.

# ОЙ, ПАРА, МАЦІ, ЖЫТА ЖАЦІ 16

(жніўная)




Ой пара, маці, жыта жаці,
Гэй, ды саломка, ох (ы), ды павяла.
Ой, ужо саломка ды павяла.
Гэй, шкада, шкада, ох (ы), вечарочка,
Ой, ды шкада мне вечарочка,
Гэй, што я дзеўка, ох (ы), ня гуляла.
Ой, што я дзеўка ня гуляла,
Гэй, забалела, ох (ы), захварэла.

# ДЫ ЎЖО СОНЕЙКА

17.

(ЖНІЎНАЯ)

*Allegro.- Хутка*




Ды ўжо сонейка пад дубком, дубком,
Добра жаці нам, ой, ды халадком.

Ды ўжо сонейка за лес коціцца,
Мне да матанькі ў госьці хочацца.

Дзе мяне мама будзе спатыкаць,
Чым мяне мама будзе частаваць?

Частуе мяне мёдам ды віном,
Вось як хо́раша ў мамкі за сталом.

# А ЖНІЦЕ, ЖНЕЯЧКІ, ЖНІЦЕ

18

(ЖНІЎНАЯ)

*Allegretto - Рухава*




А жнеце, жнеечкі, жнеце,

Ой, ды знайдзіце бабра ў жыце!

— А на што нам бабёр, бабёр?

А нам трэба кугакала!

А нам трэба кугакала,

Каб у хвасьце заплакала.

# ПАСЫЛАЛА МЯНЕ МАЦІ 19

(жніўная песьня)




Пасылалá мяне маці (2 разы)
Работачку рабатáці,
Работачку рабатаці, (2 разы)
Ядраное жыта жаці.
А я жытачка ня жала, (2 разы)
Тры нядзелькі праляжала.

# ЖНЕЦЕ, ЖНЕЦЕ, МАЕ ЖНЕЙКІ 20.

(ЖНІЎНАЯ)




Жнеце, жнеце, мае жнейкі,
Дам вам мёду па бутэльцы
Жнеце, жнеце, мае пташкі,
Навару вам добрай кашкі.
Жнеце, жнеце, мае любы,
Усім вам напару бульбы.

# ОЙ, У ПОЛІ ЛЯНОК БРАЛА 21

(ІЛЬНЯНАЯ)




Ой, у полі лянок брала,
Сама сябе забаўляла.

Вечарочак прастаяла,
Снапы лёну расстаўляла.

Шкада, што ночанька прыйшла,
А можа-б я ў танок пайшла.

# ЯРЫНКА, ЯРЫСЯ 22.

(ЯРАВАЯ)




Ярынка, Ярыся, (2 р.)
Люлі, рана!
Цімоха, жаніся!
Ой, выбірай дзевак, (2 р.)
Люлі, рана!
Выбірай на ніўцы.
У каторай постаць, (2 р.)
Люлі, рана!
Ой, ды шырэйшая,
Тую бяры замуж, (2 р.)
Люлі, рана!
Тую бяры замуж.

## ЦЯКЛА РЭЧКА ПРАЗ МЯСЬЦЕЧКА 23.

(ТАЛОЧНАЯ)




Цякла рэчка праз мясьцечка
З вішнёвага саду,
Клікаў хлопец дзяўчыначку,
Клікаў на параду.

— Парай, парай, дзяўчыначка,
Як родная маці,—
Ці мне цяпер жаніціся,
Ці цябе чакаці?

— Калі-б у лесе на верасе
Пшанічанька узышла,
Тады-б я за цябе, хлопча,
Тады-б замуж выйшла.

# АХ ВЫ, СТОЛІКІ МАЕ

24.

(ТАЛОЧНАЯ-ЗАСТОЛЬНАЯ)

*Allegro moderato.- Ня вельмі хутка*




Ах вы, столікі мае,
    вы цясовенькія,
Ды чаго-ж вы стаіцё не засьцеленыя?
Ах вы, госьцікі мае,
    маладзенькія,
Ды чаго-ж вы сядзіцё, хлеба-солі не ясьцё?
Калі хлеб наш ня пушон,
    дык мы выпалаем,
А гаспадар не вясёл--
    дык мы выпытаем.

# ХАДЗІ, РАЁК, НА МОЙ ДВАРОК 25.

(ДАЖЫНКАВАЯ)

*Allegretto - Рухава*




Хадзі, раёк, на мой дварок: (2 разы)

Мае дваркі — мяцёныя, (2 разы)

Мае сталы — засланыя (2 разы)

Кілішачкі — залатыя, (2 разы)

Хлябы мае — сітовыя, (2 разы)

Напітачкі — мядовыя. (2 разы)

# ЯК НА НАШАЙ НІЎЦЫ 26.

(ДАЖЫНКАВАЯ)




Як на нашай ніўцы
Сягоньня дажынкі.
Дзіва, дзіва, дзіва!

Відаць, маё вочка,
Што край недалёчка.
Дзіва, дзіва, дзіва!

Да краю дажнёмся,
Мёду мы нап'ёмся.
Дзіва, дзіва, дзіва!

## 27. А Ў НАС СЯНЬНЯ ВАЙНА БЫЛА

(ДАЖЫНКАВАЯ)




А ў нас сяньня вайна была, (2 разы)

А мы поле зваявалі, (2 разы)

У снапочкі павязалі, (2 разы)

У бабачкі пастаўлялі, (2 разы)

У копачкі паскладалі. (2 разы)

# ЯК ПАЙШОЎ ЖА СПАРЫШ 28

(ДАЖЫНКАВАЯ-СПАРЫШОВАЯ)




Як пайшоў-жа спарыш (2 р.)
Ды па вуліцы гуляць.

А ніхто спарыша, (2 р.)
Ніхто яго ня прыняў.

Толькі Мар'я адна, (2 р.)
Яна яго прыняла.

# ІВАНАВЫ ПЧОЛКІ 29.

(ДАЖЫНКАВАЯ-ВЯЛІЧАЛЬНАЯ)




Іванавы пчолкі па полі лятали.

Чэсьць яму, хвала яму, па полі лятали.

Па полі лятали, мядок сабіралі.

Чэсьць яму, хвала яму, мядок сабіралі.

Мядок сабіралі, у кубкі налівалі.

Чэсьць яму, хвала яму, у кубкі налівалі.

У кубкі налівалі, жнеек частавалі.

Чэсьць яму, хвала яму, жнеек частавалі.

# КАЦІЎСЯ ВЯНОЧАК З ПОЛЯ 30.

(ДАЖЫНКАВАЯ-ГУЛЬНЁВАЯ)

*Allegro - Хутка*




Каціўся вяночак з поля
Ды прасіўся ён да пакоя:
— Пусьці, пані, да пакою,
Бо я ў полі настаяўся,
Буйных вятроў наслухаўся,
Дробным дажджом намачыўся!
Пыталася пані ў яго,
Каб казаў ёй праўду усяго:
— Дзе насеньне твайго роду,
Дзе, вяночак, ты радзіўся,
Якой расой абмываўся,
Якім сонцам ґадаваўся?
Казаў-жа вяночак пані
Аб сваім ёй родзе й званьні:
— Ой, я сонцам гадаваўся,
Ў прамянёх яго купаўся,
Часам раньнім красаваўся,
З ночкай у гульнях забаўляўся.

# З Ь М Е С Т

*Бал.*


Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
1. Ай, шла Купала сялом, сялом—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . 7
2. Ды на Купальле, на Яна—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . 8
3. Ішла Купалка—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . . . . 9
4. А на Яна ночка мала—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . 10
5. Як пойдзем мы, дзеўкі—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . 11
6. На Йвана ночка маленькая—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . 12
7. А на гары цэркаўка—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . . 13
8. Ой, бору мой—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . . . . 14
9. Купалінка—*муз. Тэраўскага* . . . . . . . . . . . . . 15
10. Ой, чабор мой зялёны—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . 16
11. Васілёчак—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . . . . . 17
12. Ой, рана на Йвана—апрацоўка *Прохарава* . . . . . . . . . 18
13. Сяньня Купала, а заўтра Яна—апрацоўка *А. Туранкова* . . . 19
14. А ў купальскую ноч—апрацоўка *А. Туранкова* . . . . . . . . 20
15. Радзі, Божа, жыта—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . . . 21
16. Ой, пара, маці, жыта жаці—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . 22
17. Ды ўжо сонейка—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . . . . 23
18. А жніце, жнеячкі, жніце—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . 24
19. Пасылала мяне маці—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . . 25
20. Жнеце, жнеце, мае жнейкі—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . 26
21. Ой, у полі лянок брала—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . 27
22. Ярынка, Ярыся—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . . . . 28
23. Цякла рэчка праз мясьцечка—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . 29
24. Ах вы, столікі мае—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . . 30
25. Хадзі, раёк, на мой дварок—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . 31
26. Як на нашай ніўцы—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . . 32
27. А ў нас сяньня вайна была—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . 33
28. Як пайшоў-жа спарыш—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . 34
29. Іванавы пчолкі па полі лcraталі—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . 35
30. Каціўся вяночак з поля—апрацоўка *М. Шчаглова* . . . . . . 36


---


234443
Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

№2003 г
0-10
B000000 14 12649